# Азбука ў загадках

**П**
Падымае ўсіх
на золку,
носіць на хвасце вясёлку.
Што за кавалер,
Каторы
Мае
Рыцарскія шпоры? ***(Певень.)***

**В**
З лісця сшыт матрасік мой,
Смачна сплю на ім зімой.
Хоць гарбатая спіна,
Ды ахова мне яна. ***(Вожык)***

***В***
Ходзіць злы галодны? ***(Воўк)***
Зубамі шчоўк ды шчоўк,
Блукае ў лесе шэры ....***(воўк)***

***М***
Што за гаспадар лясны
Спіць пад снегам да вясны,
Ну а летам да калод
Ходзіць красці чужы мёд. ***(Мядзведь.)***

**Ж**
Пасля дождживчку ў чацвер
З лужы вылез страшны звер:
- Ква-ква-ква! Усіх спужаў бы,
калі б мы не знали...***(жабы)***

**З**
Сонца летняе пячэ
Альбо дождж маросіць -
Футра шэрае яшчэ
Ён да часу носіць.
Холадам дыхне зіма,
І ўсім на здзіўленне
Футра шэрага няма –
У белым ён адзенні. ***(Заяц)***

***Я***
Беленькая бочка,
На ёй ні сучочка,
Ні абручыка, ні дна,
Хоць бы клёпачка адна. ***(Яйка)***

***К***
Я хаджу, нібыта ў тапках,
Кіпцюркі ў мяне на лапках.
Я без мыла, без вады
Мыю сам сябе заўжды. ***(Кот)***

***ДЗ***
Я ў беленькім берэце,
Мая ножка не абута.
А як дзьмухне моцны вецер------
Рассыпаю парашуты.(***Дзьмухавец)***

***Ў***
У кароткае
Ні разу
Не было
Ў пачатку сказа.
Яно гук
Кароткі мае,
Коску

**В**
Шэранькі, маленькі.
сам у шэрай світцы
Шукае канапелькі,
каб трохі пажывіцца. ***(Верабей)***

**ДЗ**

На плячах трымае.
Спадзявацца я магу,
Што запомніш гэта...? ***(Ў)***

Ён у шапачцы чырвонай
Лечыць гай і бор зялёны.
Пападае на абед
Яму шкоднік-караед. ***(Дзяцел)***

**Ч**

Па пяску ледзь паўзе,
А не зловін у вадзе.
Ні рыбіна, ні птаха,
А проста ... ***(чарапаха).***

**Х**

Крыл не маюць, а лятаюць.
Ног не маюць, а бягуць.
Не ў вадзе, але з вадою.
Адгадайце, што такое? ***(Хмары)***

**Р**

У лужку-лужочку
Выраслі сястрычкі:
Залатое вочка,
Белыя раснічкі. ***(Рамонкі)***

**Л**

У рыжай разбойніцы
хвост, як мятла.
Ад кары ўцякла-
Сляды замяла. ***(Ліса)***

В

Вось вам загадка:
У дрэве хатка,
Арэшкаў горка,
Гаспадыня… (***вавёрка***).

К

Хто зялёнымі вачамі
Грозна бліскае начамі?
Мае пухленькія лапкі,
Мае кіпцікі – царапкі?
Спінку пругка выгінае,
Страх на мышак наганяе. (***Кот***)

**ДЖ** гаворыць: «Я адзін»
**ДЗ** пярэчыць : «Двое!»
А значэнне ў іх , сябры,
Дык адно і тое.
Хто, скажыце, адгадаў –
Што гэта такое?

Літары ен, як байцоў на парад,
Строгім парадкам паставіў у рад.
Усе яны пэўнае месца знайшлі там.
Як мы яго назавем? - ... .